4. *Всеволодский-Гернгросс, В.* Начало цирка на Руси / В. Всеволодский-Гернгросс // Совет. цирк. – 1957. – № 3. – С. 20–23.

5. *Гуд, П. А.* Беларускі кірмаш / П. А. Гуд, Н. І. Гуд. – Мінск : Полымя, 1996. – 272 с.

6. *Гуревич, З. Б.* О жанрах советского цирка / З. Б. Гуревич. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Искусство, 1984. – 304 с.

7. *Куніцкая, Н. У.* Станаўленне цыркавога мастацтва ў Беларусі ў XIX стагоддзі / Н. У. Куніцкая // Культура Беларусі: навуковы пошук моладзі : матэрыялы навук. канф. аспірантаў, 14 мая 1997 г. : у 2 ч. / Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1998. – Ч. 1. – С. 39–49.

8. *Макаров, С. М.* Советская клоунада / С. М. Макаров. – М. : Искусство. – 1986. – 154 с.

9. *Уварова, Е. Д.* Эстрадный театр: миниатюры, обозрения, мюзик-холлы (1917–1945) / Е. Д. Уварова. – М. : Искусство, 1983. – 320 с.

УДК [392+398.3](476)

***Н. В. Петухова,***

*кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры рэжысуры*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», Рэспубліка Беларусь*

# ФАЛЬКЛОРНА-ЭТНАГРАФІЧНЫЯ СВЯТЫ Ў ДЗЕЙНАСЦІ ЎСТАНОЎ КУЛЬТУРЫ

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны праблеме рэканструкцыі фальклорна-этнаграфічных свят супрацоўнікамі ўстаноў культуры. Апісаны шляхі арганізацыі фальклорных мерапрыемстваў: традыцыйны і інавацыйны. Асаблівая ўвага надаецца інавацыйнаму шляху, які прадугледжвае даследаванне рэгіянальных асаблівасцей пэўнага абраду, вывучэнне асобных яго элементаў (песень, танцаў, моўных выказванняў і інш.), распрацоўку сцэнарыя абрадавага комплексу. Для гэтага неабходна ўлічваць тэмпаральны, акцыянальны, лакатыўны, атрыбутыўны, персанальны, музычны і вербальны коды традыцыйнага свята.

**Ключавыя словы:** фальклор, свята, культура, народны, песня, гульня, карагод, мерапрыемства, рытуал, мастацтва, творчасць.

***N. Petukhova,***

*Candidate of Pedagogical Sciences, Associate Professor*
*of the Directing department of the Educational Institution*
*«Belarusian State University of Culture and Arts», Republic of Belarus*

# FOLKLORE AND ETHNOGRAPHIC HOLIDAYS IN THE ACTIVITIES OF CULTURAL INSTITUTIONS

**Abstract.** The article is devoted to the problem of recreating folk and ethnographic holidays by the staff of cultural institutions. The article describes the ways of organizing folklore events: traditional and innovative.Particular attention is paid to the innovative way, which involves the study of regional features of a particular traditional rite, the study of its individual elements (songs, dances, language expressions, etc.), the development of the scenario of the ritual complex. For this purpose, it is necessary to consider temporal, action, locative, attributive, personal, musical and verbal codes of the traditional holiday.

**Keywords:** folklore, holiday, culture, folk, song, game, carousel, event, ritual, art, creativity.

У сучасным жыцці краіны ўстановы культуры выконваюць вядучую ролю ў захаванні і распаўсюджванні нацыянальных каштоўнасцей, ствараюць спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі сацыяльна-культурнай актыўнасці насельніцтва праз удзел у фальклорна-этнаграфічных святах.

Фальклорна-этнаграфічныя святы з'яўляюцца неад'емнай часткай жыцця грамадства. Іх змест і форма дэтэрмінаваны этнакультурнымі традыцыямі, сацыяльнымі стэрэатыпамі, эканамічнымі і іншымі фактарамі. У наш час, калі фальклорныя элементы знікаюць з побыту людзей, узрастае неабходнасць арганізацыі спецыяльных мерапрыемстваў, якія адлюстроўваюць паўнаводную плынь народнай мастацкай творчасці, дэманструюць узровень асэнсаванасці той ці іншай фальклорнай з'явы.

Абласныя цэнтры народнай творчасці, раённыя метадычныя цэнтры, клубныя ўстановы арганізуюць фальклорна-этнаграфічныя святы, фестывалі. Прапагандаваць і ўкараняць у культурнае жыццё фальклор свайго народа – гэта іх адказны і ганаровы абавязак. На Беларусі паўсюдна праводзяцца «Купалле», «Масленіца», «Гуканне вясны», на мясцовым матэрыяле адраджаюцца святы «Камаедзіца» (Новабыхаўскі СДК Быхаўскага раёна), «Жаніцьба коміна» (Краснабеларускі СДК Быхаўскага раёна), «Каляды» (Хаціслаўскі СДК Маларыцкага раёна), «Провады русалкі» (Вялікаборскі СДК Хойніцкага раёна), «Ваджэнне куста» (Брэсцкі абласны грамадска-культурны

цэнтр), «Конікі» (Давыд-Гарадоцкі ДК Столінскага раёна), «Куры» (Клічаўскі ДК) і інш.

Як бачым, фальклорна-этнаграфічныя святы трывала «прыжыліся» ў вёсках і раённых гарадах, дзе было гістарычна сфарміравана адпаведнае сацыякультурнае асяроддзе. Работнікі культуры штогод аднаўляюць старажытныя абрады ў першапачатковым выглядзе, выкарыстоўваючы песні, танцы, гульні. У правядзенні і падрыхтоўцы такіх мерапрыемстваў прымаюць актыўны ўдзел дзеці, моладзь і людзі сталага ўзросту. Святы праводзяцца на адкрытай пляцоўцы, таму набываюць характар усеагульнага народнага гуляння.

Арганізацыя фальклорна-этнаграфічных свят здзяйсняецца двума шляхамі. Першы – традыцыйны, калі калектыў аматарскай творчасці рыхтуе для дэманстрацыі той ці іншы абрад. Другі шлях – інавацыйны. Ён прадугледжвае даследаванне рэгіянальных асаблівасцей пэўнага традыцыйнага абраду, вывучэнне асобных яго элементаў (песень, танцаў, моўных выказванняў і інш.), распрацоўку абрадавага комплексу. Дадзены падыход, на наш погляд, адкрывае перспектывы для ўвядзення фальклорна-этнаграфічных свят у кантэкст сучаснай культуры ў якасці эстэтычна пераасэнсаванай традыцыі.

На этапе падрыхтоўкі сцэнарыя фальклорна-этнаграфічнага свята неабходна ўлічваць архітэктоніку кодаў (асноўных кампанентаў) яго правядзення. Паводле высноў даследчыкаў С. М. і Н. І. Талстых, яна выбудоўваецца наступным чынам:

тэмпаральны код – час правядзення абраду (свята);

акцыянальны код – паслядоўнасць абрадавых дзей (рытуал);

лакатыўны код – месца правядзення абраду (свята);

персанальны код – кола ўдзельнікаў, наяўнасць маскаваных персанажаў;

атрыбутыўны код – выкарыстанне абрадавых атрыбутаў, адзення, маскавання;

музычны код – тыповыя напевы з адмысловымі этнафанічнымі прыкметамі і гукаідэал інструментальнай этнафоніі;

вербальны код – наяўнасць заклікаў, замоў, зычэнняў у абрадзе [2, с. 51].

Адно з такіх свят – «Каляды» – штогод праводзіцца ў Хацiслаўскім сельскім Доме культуры Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці. Яго арганізатарамі выступаюць дырэктар СДК

Галіна Іванаўна Хомік і фальклорныя калектывы «Хацісла-вяне» і «Вясковая табала». Абрадавае дзейства яны змаглі адрадзіць амаль у першапачатковым выглядзе, выкарыстоўваючы старадаўнія гульні, песні, танцы, народны гумар. Тут пануе сапраўдная весялосць, у свяце ўдзельнічае ўся вёска, калядоўшчыкаў чакаюць у кожнай хаце, цікава, што велічальныя песні любяць і спяваюць усе жыхары населенага пункта.

Яшчэ адно самабытнае фальклорна-этнаграфічнае свята – «Ваджэнне і пахаванне стралы» – праводзіцца ў в. Стаўбун, Пералёўка, Неглюбка і Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна. Як распавядае метадыст па фальклоры Гомельскага абласнога цэнтра народнай творчасці І. В. Глушэц, гэта свята ў першую чаргу скіравана на адвядзенне маланкі ад вёскі і выкліканне дажджу для добрага ўраджаю. Завадатарамі яго правядзення з'яўляюцца ўдзельніцы фальклорнага ансамбля «Стаўбунскія вячоркі». Прыязджаюць на мерапрыемства шматлікія госці. Так, на працягу 10 гадоў да свята далучаюцца студэнты спецыялізацыі «этнафоназнаўства» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Разам з носьбітамі фальклору яны ўдзельнічаюць у святочным шэсці, водзяць карагоды, спяваюць песні, выконваюць рытуальныя дзеянні.

Акрамя таго, на працягу 20 гадоў на Ушэсце да Марыі Лаўрэнаўны Зуевай, мясцовай спявачкі, прыяджае са сталіцы Расіі фальклорны ансамбль «Народный праздник» пад кіраўніцтвам Я. С. Косцінай і далучаецца да выканання абраду. Трэба дадаць, што абрад узяты пад ахову дзяржавы і мае статус нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці з 2006 г. [1].

Ёсць надзея, што дзякуючы плённай працы метадычных цэнтраў, клубных устаноў, дамоў культуры фальклорна-этнаграфічныя святы нашай Радзімы будуць радаваць і натхняць нас яшчэ доўгі час, захоўвацца і перадавацца наступным пакаленням.

*1.* Гамзовіч, Р. «Ішла стряла у канец сяла…» [Электронны рэсурс] // Р. Гамзовіч // Культура. – 2010. – № 23 (943). – 5–11 чэрв. – Рэжым доступу: http://www.kimpress.by/index.phtml?page=2&id=4141&mode=print. – Дата доступу: 19.08.2021.

*2. Толстой, Н. И.* Славянская этнолингвистика: вопросы теории : ко Второму Всероссийскому совещанию славистов, Москва, 5–6 нояб. 2013 г. / Н. И. Толстой, С. М. Толстая. – М. : Ин-т славяноведения РАН, 2013. – 240 с.